

DC
COMICS™

THE NEW 52!

BATMAN™

20 | $3.99 US

SCOTT SNYDER
GREG CAPULLO
DANNY MIKI

BY COMICS

БЭТМЭН #20 (2011)
ПЕРАКЛАД І АФАРМЛЕННЕ:
COMICSBY

THE DARK KNIGHT
BATTLES
BRUCE WAYNE?!

Capullo 13 +fco





DC COMICS™

BATMAN™

20 $3.99 US

THE NEW 52!



SCOTT
SNYDER

GREG
CAPULLO

DANNY
MIKI

DC COMICS прадстаўляе БЭТМЭНА ў


ЧАЛАВЕК З НІАДКУЛЬ


частка другая


ГЭТА КАНЕЦ, БРУСІ!

СКОТ СНАЙДАР, ГРЭГ КАПУЛА
ДЭНІ МІКІ, ФРАНКА ПЛАЦЭНСІЯ
КОМІКРАФТ, КЭЦІ КУБЕРТ
МАЙК МАРТС
БЭТМЭН СТВОРАНЫ
БОБАМ КЕЙНАМ


*НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫЯ І ДАСВЕДЧАНА-КАНСТРУКТАРСКІЯ РАСПРАЦОЎКІ
УЭЙН ЭНТЭРПРАЙЗІС, НДДКР*
МАБЫЦЬ ТЫ І ВЫСКЛІЗНУЎ НА СЕКУНДУ, АЛЕ ТАБЕ НЕКУДЫ СХАВАЦЦА АД МЯНЕ. НАВАТ ТУТ, У ТВАІМ МАЛЕНЬКІМ АРСЕНАЛЕ.


ХТО КХЕ... ХАВАЕЦЦА, ГЛІНЯНАТВАРЫ?
ХЕХ. ЗГАДЖУСЯ, ТЫ АДВАЖНЫ ХЛОПЕЦ!


ВОСЬ ТАБЕ КВІТОК У СТАРЫ ЗАГАРАДНЫ КЛУБ НА НЯБЁСАХ, ПРЫЯЦЕЛЬ.




РАСПАЗНАН-
НЕ ГОЛАСУ!
ЗАБПУСЦІЦЬ БЭТ-
БОТАЎ!

ЗАПУСК...
ЦЭЛЬ?
ВЫ ГЛЯДЗІЦЕ
НА ЯЕ. ГЭТА
ВЯЛІКАЯ
СМЯРДЗЮЧАЯ
КУЧА...

НЕ, БЭТ-БОТЫ,
АДКЛЮЧАЙЦЕСЯ!
ГОЛАС РАСПАЗНА-
НЫ... АДКЛЮЧЭННЕ...
НЕ, Я
СКАЗАЎ...
А Я
СКАЗАЎ...

...ГЭТА НЕ
АДБУДЗЕЦ-
ЦА, БРУСІ.


АЛЕ ЗДАРЫЦЦА ВОСЬ ШТО. ТЫ, СЯБРА, ЗРОБІЎ НЕКАЛЬКІ ДРЭННЫХ СПРАЎ...
...ВЕЛЬМІ, ВЕЛЬМІ ДРЭННЫХ СПРАЎ. ХЕХ.
РАЗУМЕЕШ, ЗА АПОШНІЯ НЕКАЛЬКІ МЕСЯЦАЎ, З ТЫХ ЧАСОЎ, ЯК Я «ЭВАЛЮЦЫЯНІРАВАЎ», ЯК ТЫ КАЖАШ, Я РЭАЛЬНА СТАЎ ПАСПЯХОВЫМ, БРУСІ. У МЯНЕ БІЗНЕС У ГОРУ ІДЗЕ.
БО БАГАТЫРЫ, ТАКІЯ ЯК ТЫ, БОЛЬШ ЗА ЎСЁ БАЯЦЦА СКАНДАЛАЎ. ВАРТА ТОЛЬКІ ПРЫСТРАШЫЦЬ ПАКІНУЦЬ АДПЯЧАТАК ПАЛЬЦА НЕ Ў ТЫМ МЕСЦЫ... У ДОМЕ РАСПУСНІЦ. ЦІ НА ЗБРОІ...
...МАЛЕНЬКІЯ ГРАШОВЫЯ СТРУМЕНІ, МОЙ СЯБАР. НІЧОГА БУЙНОГА, ШМАТ ДРОБНЫХ СТРУМЕНЯЎ ЗЕЛЯНІНЫ АД УСІХ ТВАІХ СЯБРОЎ. АКРАМЯ АДНАГО.
БРАЙАН УЭЙД.
ВЯЛІКІ ХЛОПЕЦ НЕ ХАЦЕЎ ГУЛЯЦЬ У МАЕ ГУЛЬНІ, ТАМУ Я ЗРАБІЎ ЯГО КОПІЮ. ПРАБЛЕМА Ў ТЫМ, ШТО БЕДНЫ ЁЛУПЕНЬ УЗБРЫКНУЎ РАНЕЙ, ЧЫМ ПРЫЙШЛА СМЕРЦЬ НАВАСТРЫЛА СВАЮ КАСУ.


І ГЭТА ЗАКРАНУЛА ТВАЙГО СЯБРА БЭТМЭНА.
І ТАМУ... КАЛІ Я ХАЧУ, КАБ МАЕ МАЛЕНЬКІЯ СТРУМЕНЬЧЫКІ ЗЕЛЯНІНЫ БІЛІ ФАНТАНАМ, МНЕ ТРЭБА БУДЗЕ ПАЗБАВІЦЦА АД БЭТМЭНА НАЗАЎЖДЫ.
СПРАВА Ў ТЫМ, ШТО МНЕ ТРЭБА ТОЛЬКІ ДАКРАНУЦЦА ДА ЯГО... І ЎВЕСЬ СВЕД ДАВЕДАЕЦЦА, ХТО ЁН. ЯНЫ КІНУЦЬ ЯГО Ў АРКХЭМ РАЗАМ З АСТАТНІМІ ЯГО СЯБРАМІ.


І ЯК ЖА НЕ СКАРЫСТАЦЦА ЯГО ЛЮБІМЫМ ЖЫХАРОМ ГОТЭМА, ЯГО АСАБІСТЫМ ДАБРАДЗЕЕМ, МІСТАРАМ БРУСАМ УЭЙНАМ? ГЭТА ЛЕПШЫ СПОСАБ ПРЫВАБІЦЬ БЭТМЭНА! ТЫ СТАНОВІШСЯ ДРЭННЫМ, ВЫКАРЫСТОЎВАЮЧЫ ЯГО ПРЫЛАДЫ, КАБ СЕЯЦЬ ХАОС, ЁН З'ЯВІЦЦА, Я КРАНАЮСЯ ЯГО І КЛАДУ КАНЕЦ ЯГО СПРАВАМ. А САМАЕ ГАЛОЎНАЕ, НІХТО НАВАТ НЕ ДАВЕДАЕЦЦА, ШТО Я БЫЎ ТУТ.
ТАКІМ ЧЫНАМ, МНЕ ШКАДА, БРУСІ, АЛЕ ГЭТА КАНЕЦ. ТАБЕ БОЛЬШ НЕКУДЫ ДЗЕЦЦА, АКРАМЯ ЯК...


...У МАЮ ПАСТКУ!

Я ПРЫВЁЎ ТАБЕ КАМПАНІЮ, СТАРЫ.













ЯГО ЗАБЛАКАВАЛІ.

ХТО?

ЗДАЕЦЦА, Я, ЦІ ХУТЧЭЙ, ГЛІНЯНАТВАРЫ Ў МАІМ АБЛІЧЧЫ.


ЗВЕРХУ ЁСЦЬ ПАВЕТРАНАЯ КІШЭНЬ? Я МАГУ ПАДНЯЦЬ ЦЯБЕ...
НЕ, ЯНА ГЕРМЕТЫЧНА. ЯНА РАЗАРВЕ НАС НА ЧАСТКІ.
ЯК НАКОНТ АБЛОМКАЎ, ТУТ ЁСЦЬ ШТО-НЕБУДЗЬ?

НЕ. УСЯ ЗБРОЯ АБЯСШКОДЖВАЕЦЦА ПЕРАД...
ПАЧАЦЬ СЦІСКВАННЕ
СЦІСКВАННЕМ.
АЛЕ, МАГЧЫМА...

ВОСЬ!
ШТО ТАМ?

ГЭТА КАНЦЭПТУАЛЬНЫ ГАРНІТУР. ВОСЬ, ДАПАМАЖЫ МНЕ АПРАНУЦЬ ЯГО!
ІМ МАГУ КІРАВАЦЬ Я, ЛЮЦЫЮС!
НЕ СМЯШЫ МЯНЕ, БРУС! АДЫДЗІ, ПАКУЛЬ НЕ ПАШКОДЗІЎСЯ!

ГАТОВА, ЛЮЦІЮС.
ДОБРА... ШТО Ж, ПАСПЯШАЙСЯ!






І ТЫ ВЫКІНУЎ ГЭТА? ЧАМУ?
ТАМУ ШТО ГЭТА РЭЧ СТАНЕ АКУПЛЯЛЬНАЙ ТОЛЬКІ ПРАЗ ДВАЦЦАЦЬ ГОД. АЛЕ ЁСЦЬ І ІНШЫЯ ПРЫЧЫНЫ. Я РАСКАЖУ ЦЯБЕ НЕЯК.
АЛЕ ЗАРАЗ ТАБЕ ЛЕПШ АТРЫМАЦЬ МЕДЫЦЫНСКУЮ ДАПАМОГУ. ЦЯБЕ ТАМ ПАШТУРХАЛА, БРУС. ТЫ НЕ БЭТМЭН. ТВАЁ ЦЕЛА НЕ ЗВЫКЛА ДА ТАКІХ КАТАВАННЯЎ.
НІКОЛІ НЕ НЕДААЦЭНЬВАЙ МАГЧЫМАСЦЯЎ БАГАЦЕЯЎ, ЛЮЦЫЮС. АЛЕ НАВАТ КАЛІ І ТАК, ДОКТАР МОЖА ПАЧАКАЦЬ. ПАЙДУ ЗНІМУ ГЭТА І ВЫКЛІКАЮ ПАЛІЦЫЮ. А ТЫ ПАТЭЛЕФАНУЙ БЭТМЭНУ.
САПРАЎДЫ, БРУС, ТЫ АТРЫМАЎ ТАМ НЕКАЛЬКІ МОЦНЫХ ШТУРШКОЎ, ТАБЕ ТРЭБА...
ТЫ МАЕШ РАЦЫЮ, ЛЮЦЫЮС. АЛЕ ЯК ТАБЕ ДОБРА ВЯДОМА, ЧАСАМ...


«...Я САМ САБЕ
ЛЮТЫ ВОРАГ».
ДЖОФФРИ
МАССАЖ
НОГ


РАСПРОДАЖА








КОМИКСЫ






ПАЧАКАЙЦЕ, ГЭТА НЕ...


О, ГЭТА ТВОЙ ПРЫПЫНАК!

УЭЙН І ФОКС У БЯСПЕЧНЫМ МЕСЦЫ, КАРЛА.

І Я ПАПЯРЭДЗІЎ ПАЛІЦЫЮ АБ ЗМЕНАХ, ЯКІЯ ТЫ АТРЫМАЎ. ТЫ БОЛЬШ НЕ БУДЗЕШ ПАДСТАЎЛЯЦЬ НЯВІННЫХ ЛЮДЗЕЙ. БОЛЬШ НІЯКАГА ВЫМАГАЛЬНІЦТВА.

ЗГОДНЫ! ТАДЫ, МОЖА, ТРОХІ ЗАБОЙСТВА?!

АААААААА!

ПРАВІЛЬНА, БРУС, НЕ ДАВАЙ ЯМУ ПАСЛАБЛЯЦЦА.

МАЛІСЯ, КАБ ФТАРЫД ВАДАРОДА ЎСЁ ЯШЧЭ ПРАЦАВАЎ...

ХАХ. ДОБРАЯ СПРОБА, СТАРЫНА...


БЭТМЭН, ДЗЯКУЙ БОГУ, ТЫ ТУТ. Я НЕ МАГУ ДАЛУЧЫЦЦА. ЁН ПАМЯНЯЎ МЕТАДЫ ШЫФРАВАННЯ Ў МАІМ АКАЎНЦЕ... МНЕ ТРЭБА ЯШЧЭ ТРОХІ ЧАСУ.
ЛЮЦЫЮС, КОЛЬКІ ЯШЧЭ ДА ГАТОВАСЦІ?
АЛЕ Я ЎЖО НЕ ТВОЙ ТАТУЛЯ ГЛІНЯНАТВАРЫ!


У МЯНЕ БОЛЬШ НЯМА... МААА!


ЗГАДЖУСЯ, БЭТСС...


...Я ЗАЎСЁДЫ ЛІЧЫЎ, ШТО ГЭТА Я ТАБЕ ПРЫКОНЧУ! АЛЕ ВОСЬ ТАБЕ КАРЛА, СТАРЫНА! ХАХАХАХА!


ТАК, З МЯНЕ НІЗКІ ПАКЛОН, ВАХ!
ГЭТА, КАНЕШНЕ, ДЗІЎНЫ АДКАЗ, АЛЕ ЗГАДЖУСЯ...



МЫ ЎСЕ АБЯРНЕМСЯ Ў ГЛІНУ, ДЖЭНТЭЛЬМЕНЫ. КАЛІ ПАДУМАЦЬ, У РЭШЦЕ РЭШТ ВЫ ЎСЕ ДАСТАНЕЦЕСЯ МНЕ.


АЙ!
КХАК!


ДОБРА, БРУС, ТЫ ПАСПРАБАВАЎ РАСТВАРАЛЬНІК.
ТЫ ПАСПРАБАВАЎ АХАЛАДЖАЛЬНІК.
ТЫ ПАСПРАБАВАЎ УСЁ, ШТО ПАЎСПЛЫВАЛА НА СТАРО-ГА ГЛІНЯНАТВАРАГА... АКРАМЯ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ...


БЭТМЭН, ПАКАЗЧЫКІ ГАРНІТУРА...
Я ВЕДАЮ!


...ВЫДАЙ УСЁ, ШТО ЁСЦЬ, БРУС, УСЁ, ШТО ЗАСТА-ЛОСЯ Ў ГАРНІТУРА!


І МАЛІСЯ, КАБ ГЭТА СПРАЦАВАЛА!


УХ.
ХЕХ. СКУБЕЦЦА. ХАДЗІ СЮДЫ, ПРЫЯЦЕЛЬ.
А ЦЯПЕР ДАВАЙ УСКРЫЕМ ТВАЮ МАЛЕНЬКУЮ КАНСЕРВНУЮ БАНКУ...


...І ПАГЛЯДЗЕМ, ХТО ТЫ...
СТАЯЦЬ!


НУ, ГЭТА НЕ ТОЕ, ЧАГО Я ЖАДАЎ, АЛЕ ТОНКІ РАЗЛІК І ЎСЁ ТАКОЕ, ТАК?
У РЭШЦЕ РЭШТ, Я ЎСЁ Ж РАДЫ, ШТО ВЫ ЎСЕ ПРЫЙШЛІ ПАГЛЯДЗЕЦЬ... ХТО ГЭТЫ ПСІХ.


НЕ...
ПОЛИЦИЯ


ІДЗІ ДА ЧОРТА.


ДОБРА! А ЦЯПЕР ДАВАЙЦЕ ПУСЦІМ ТЫТРЫ, ГА? РОЛЬ БЭТМЭНА ВЫКОНВАЕ...


...А! БРУС УЭЙН!

...
ПОЛИ
ИЦИЯ


БЭТМЭН, ГАТОВА!
ДАВАЙ, ЛЮЦЫ-ЮС!

ШТО СКАЖАЦЕ, КАМІСАР? ВІДАЦЬ, БАГАЦЕНЬКІ ХЛОПЧЫК БРУС УЭЙН ПАТРАПІЦЬ...
BPPPPPP...

ГА?

ШТО ЗА?...


ДУМАЕШ, ГЭТА ЗМОЖА МЯНЕ СТРЫМАЦЬ, УЭЙН?


ТАК. ДУМАЮ, ЦІ БАЧЫШ, КАРЛА, ГЭТА ПАНІЧНАЯ КАМЕРА. НІ ЎНУТР, НІ ВОНКІ.
ЯНА МОЖА БЫЦЬ ЗАПРАГРАМАВАНА ТОЛЬКІ ДЛЯ АДНАГО ЧАЛАВЕКА. І ПАКОЛЬКІ Я НЕ МАГУ БЫЦЬ УПЭЎНЕНЫ, ДА КАГО ТЫ ДАКРАНАЎСЯ Ў УЭЙН ІНТЭРПРАЙЗІС, Я ЗАПРАГРАМАВАЎ ЯЕ ТАК, КАБ ЯНА АДЧЫНІЛАСЯ ТОЛЬКІ АДНАМУ ЧАЛАВЕКУ, ГЕНЕТЫЧНАГА КОДА ЯКОГА, Я ВЕДАЮ, У ЦЯБЕ БОЛЬШ НЯМА.
БАЗІЛЬ КАРЛА.


ДА НАШАГА ШЧАСЦЯ, БРУС УЭЙН ТАКІ ПАРАНОІК.


ХОЧАШ СКАЗАЦЬ, ТЫ ТАКІ ПАРАНОІК, УЭЙН. ЦЯПЕР МЫ ЎСЕ ВЕДАЕМ ТВОЙ САКРЭТ.





ГЭТА ВАЛАКОННАЯ МАСКА. Я ЎЗЯЎ АДПЯЧАТАК УЭЙНА ПАСЛЯ ТАГО, ЯК РАТАВАЎ ЯГО З ДРАБНІЛКІ. ДНК, ЯКОЙ ТЫ ЎЗЯЎ У МЯНЕ, ЯГО.
ЦЯПЕР МНЕ ТРЭБА ДАСТАВІЦЬЯ ЯГО Ў ШПІТАЛЬ.


АГА, ІДЗІ ПАКЛАПАЦІСЯ ПА ІМ, БЭТМЭН! ІДЗІ ПАТУРБУЙСЯ ЗА СВАЙГО БАГАЦЕНЬКАГА СЯБРА.
ЁН ТАКІ Ж, ЯК УСЕ, РАЗУМЕЕШ? УЭЙН НЕ КЛАПАЦІЦЦА НІ ПА КІМ, АКРАМЯ СЯБЕ, НАВАТ ПА СВАІХ СЯБРАХ...
ПАЛІЦЫЯ


...НАВАТ ПА ТВАЙМУ ЧОРТАВА-МУ СЫНУ.




ТАК. Я НІКОЛІ НЕ БУДУ АДЧУВАЦЬ ВІНУ ЗА ТОЕ, ШТО ШАНТАЖАВАЎ ТАКІХ ХЛОПЦАЎ, ЯК УЭЙН. НІКОЛІ! ВЕДАЕШ, Я БАЧЫЎ ЯГО РАЗАМ З МАІМ СЫНАМ. Я БАЧЫЎ ЯГО НЕКАЛЬКІ ТЫДНЯЎ НА-ЗАД НА АДКРЫЦЦІ ПАРКА, ЯКІ БЫЎ СПАНСІРАВАНЫ ЎЭЙНА.
ТАДЫ Я КРАНУЎСЯ ДА ЎЭЙНА. ЯГО СЫН РАЗМАЎЛЯЎ З ІМ, АЛЕ ЁН НЕ СЛУХАЎ, І Ў ЯГО БЫЎ ТАКІ АДСУТНЫ ПОГЛЯД НА ТВАРЫ... ЯК І ВА ЎСІХ ЯМУ ПА-ДОБНЫХ. ВЯДОМЫ ПРАЦАЙ, СЛА-ВАЙ, ЯГО НІКОЛЬКІ НЕ ХВАЛЮЮЦЬ ПАКУТЫ БЛІЗКІХ.




ПРЫКРЫЙ СВАЮ ЗЯПУ.


ЧУЕШ МЯНЕ?
ЗАПХНІ СВОЙ ПАГАНЫ...


БЭТМЭН.


«АД ЯГО ЗУСІМ НІЧОГА НЕ ЗАСТАЛОСЯ?..»


...НІВОДНАЙ РЭШТКІ БАЗІЛЯ КАРЛА?
АД ЯГО ЗАСТАЎСЯ БРУДКІ СЛЕД, АЛЕ ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ТЫДНЯЎ ЗНІКНЕ І ЁН.


АД ЯГО ЗАСТАНЕЦЦА ПУСТОЕ МЕСЦА. ДАСКАНАЛЫ ГЛІНЯНЫ ЧАЛАВЕК, ЯКІ МОЖА БЫЦЬ КІМ ЗАЎГОДНА, АКРАМЯ ТАГО ЧАЛАВЕКА, ЯКІМ ЁН БЫЎ КАЛІСЬЦІ.


ШТО Ж, Я ЗНАХОДЖУ ГЭТА ТРАГІЧНЫМ І Я Б НЕ ПАЖАДАЎ ГЭТАГА НІКОМУ, НАВАТ КАРЛА. ГЭТА ТАК ЖА АГІДНА, ЯК І ЯГО ЎЧЫНКІ.
ХЕХ.


МЯРКУЮ, ВЫ НЕ ПРЫЙДЗЕЦЕ НА АБЕД? Я РАЗАГРЭЮ ЯГО ДЛЯ ВАС, СЭР.


АЛЬФРЭД...
Я НЕ СТРАЧВАЮ СЯБЕ НА ГЭТЫ РАЗ, ЯК ГЭТА БЫЛО З ДЖЭЙСАНАМ. Я ПРОСТА...
...НЕ ГАТОВЫ ЯГО АДПУСЦІЦЬ.


ЦІ МАГУ Я ПАГЛЯДЗЕЦЬ З ВАМІ, СЭР?

«ЭХ, АДЗІН УДАР, І ЖНЕЦ ГАТОВЫ. ЯКІ ЛЁГКААТЛЕТ».

«МАБЫЦЬ, ГЭТА ПРОСТА БЫЎ ТАКІ ВЫДАТНЫ ЎДАР, РОБІН».

«ШТО, ГЭТА АНТЫДОТ? КОЛЬКІ МНЕ ТРЭБА, КАБ...»

«УСЁ ДА АПОШНЯЙ КРОПЛІ».

«ТТ..»

«ТЫ ЖАРТУЕШ».

«ЖАРТУЮ. ДАСТАТКОВА ДЗЕСЯЦІ МІЛІГРАМ».

«...»

«...»

«ЭХ. УЖО АДЧУВАЮ СЯБЕ ЯК НОВЕНЬКІ».

«ШТО ДАЛЕЙ?»

«У БЭТМАБІЛЬ, БАЦЬКА».

«РОБІН...»

«ПРАБАЧ! Я ХАЦЕЎ СКАЗАЦЬ **БЭТМЭН**».

«Я ХАЦЕЎ СКАЗАЦЬ БЭТМЭН...»

НАСТУПНЫМ РАЗАМ: НУЛЯВЫ ГОД... ПАХОДЖАННЕ БЭТМЭНА


«Я ЛІЧЫЛА, ГЭТА ГЛУПАЕ ІМЯ. **БЛУКАЮЧЫ АГЕНЬЧЫК**».
«ШТО МОЖА БЫЦЬ ДРЭННАГА, КАЛІ ВЫКЛІКАЦЬ ЯГО? АЛЕ ЁН НЕ ЛІЧЫЎ ГЭТА ЖАРТАМ».
«ЁН СКАЗАЎ, ШТО ГЭТА **ПАЖЫРАЛЬНІК ДУШ**... ЯКІ АТРЫМЛІВАЕ СІЛУ КОЖНАЙ ЗАБРАНАЙ ДУШЫ. І КАЛІ ЁН ЗАБЯРЭ НАС АБОДВУХ, ТАДЫ ЗМОЖА СВАБОДНА ВАНДРАВАЦЬ ПА ЗЯМЛІ».


«Я ДУМАЛА, ЁН **ЖАРТАВАЎ**... НУ, ТАМУ ШТО ГЭТА **НЕДАРЭЧНА**, ЦІ НЕ ТАК? ЁН ТОЛЬКІ СКАЗАЎ НЕ ВЫХОДЗІЦЬ ЗА **КОЛА З СОЛІ**».


«У ІМ БЫ БЫЛІ Б У **БЯСПЕЦЫ**».


«АЛЕ ПОТЫМ З'ЯВІЛІСЯ СФЕРЫ... ЯНЫ БЫЛІ ТАКІМІ **ПРЫГОЖЫМІ**. МЫ НЕ ЗМАГЛІ ЎСТРЫМАЦЦА».


«І МЫ ВЫЙШЛІ ЗА КОЛА».


«ТАДЫ МЫ ЗРАЗУМЕЛІ, ШТО ВЫКЛІКАЛІ НЕШТА **ЖУДАСНАЕ**».
«ПРАМА ПЕРАД ТЫМ, ЯК ЁНО ВЫРВАЛА **ДУШЫ** З НАШЫХ ЦЕЛАЎ».



БЭТМЭН...

...У МЯНЕ ТУТ НЕВЯЛІКАЯ ПРАБЛЕМА. КОЖНЫ РАЗ, КАЛІ Я КРАНАЮСЯ ЯГО, МЯНЕ ХАПАЕ **КУРЧА**. МАЁ ЦЕЛА ЎРАЗЛІВА ДА МАГІІ...

ТЫ НЕ МОЖАШ ДАЗВОЛІЦЬ ЯМУ ПЕРАМАГЧЫ СЯБЕ, СУПЕРМЭН. З ТВАЁЙ СІЛАЙ ЁГО ФАКТЫЧНА НЕМАГЧЫМА БУДЗЕ **СПЫНІЦЬ**!

УФФФ!

ДЗЯКУЙ ЗА ЎКАЗАННЕ.

ПРЫВІДНАЕ СВЯТЛО

ЧАСТКА 2 (2)

ДЖЭЙМС ЦІНІЁН IV, АЛЕКС МАЛЕЕЎ, БРЭД АНДЭРСАН, ДЭЗІ СІЕНЦІ, КЭЦІ КУБЕРТ, МАЙК МАРТС

БЭТМЭН СТВОРАНЫ БОБАМ КЕЙНАМ.


АСЦЯРОЖНА!

КАЛІ ЁН ПРАРВЕЦЦА Ў КОЛА І АТРЫМАЕ ДЗЯЎЧЫНКУ, ТАДЫ БОЛЬШ НЕ БУДЗЕ ПРЫВЯЗАНЫ ДА ГЭТАГА МЕСЦА.
НАМ ТРЭБА ТРЫМАЦЬ ЯГО ТУТ.
ЧЫМ Я МАГУ ДАПАМАГЦІ?

ВЫЙГРАЙ МНЕ ЧАС. МНЕ ТРЭБА ЗНАЙСЦІ СПОСАБ АДКЛІКАЦЬ ЯГО.

ЗАГАВОР, ЯКІ ВЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЛІ... ЁН ЗАПАМІНАЎ ЯГО ЦІ ЧЫТАЎ?
ЧЫТАЎ... ЁН ВЫРВАЎ ЯГО З КНІГІ Ў ПАДЗЕЛЕ СТАРАЖЫТНЫХ МАНУСКРЫПТАЎ...

МВВААААААХХ!
ТЫ МНЕ ТАКСАМА НЕ ВЕЛЬМІ ПАДАБАЕШСЯ.

НА ЯГО ЦЕЛЕ НЯМА СЛЯДОЎ ПАПЕРЫ.


ПАЧВАРА АДКІНУЛА ЯГО... АЦЦЯГНУЛА НАШЫ ЦЕЛЫ Ў КУТ.
ДЗЕ СТАЯЎ ТВОЙ СЯБАР, КАЛІ ПАМЁР?!
Я... Я НЕ **ПАМЯТАЮ...**


МНЕ ТРЭБА, КАБ ТЫ **ПАДУМАЛА.**
ГЭТА ЎСЁ МАЯ ВІНА! Я ЗАБІЛА ЯГО... ТОНІ МЁРТВЫ З-ЗА...



ЦІШЭЙ. ЯК ЦЯБЕ КЛІЧУЦЬ?
...БЕККА.
БЕККА...


...ГЭТЫ ЧАЛАВЕК... АДЗІН З МАІХ САМЫХ БЛІЗКІХ СЯБРОЎ. ЁН ТУТ СЁННЯ, БО ХОЧА ДАПАМАГЦІ МНЕ ПРАЙСЦІ ПРАЗ... НЕШТА.
ЁН ТУТ, БО **КЛАПОЦІЦЦА.**


ТОЛЬКІ ТОЕ, ШТО ЁН СТАІЦЬ ТУТ, ЗАБІВАЕ ЯГО. ЯГО ЦЕЛА ЎЗАЗЛІВА ДА МАГІІ.
ЁН МОГ БЫ ЗБЕГЦІ, АЛЕ ЗАМЕСТ ГЭТАГА ЁН Б'ЕЦЦА, ТОЛЬКІ КАБ НАШЫЯ ЦЕЛЫ І ТВАЯ ДУША БЫЛІ Ў БЯСПЕЦЫ.



МНЕ ТРЭБА, КАБ ТЫ ДАПАМАГЛА МНЕ ВЫРАТАВАЦЬ ЯГО ЖЫЦЦЁ. БЕККА, ТЫ ДАПАМОЖАШ МНЕ?
ТЫ ДАПАМОЖАШ МНЕ РАТАВАЦЬ МАЙГО СЯБРА?


ТОНІ ПАМЁР... У ТЫМ КУЦЕ.



БАХ
ДАПАМОГА Б... НЕ ПЕРАШКОДЗІЛА. МНЕ СТАНОВІЦЦА ЦЯЖКА ЗНАХОДЗІЦЦА ТУТ.


ПРАЦУЮ НАД ГЭТЫМ.




ХМ.


МНЕ ТРЭБА «СЫХОДЗЬ» НА ГАЛЬСКАЙ. ЦІ «ЗГІНЬ».


ДЗЯКУЙ.
БЭТМЭН, ПЭЎНА, ЁН ДАБРАЎСЯ ДА МЯНЕ...
БЭТМЭН... Я НЕЯК ДРЭННА **АДЧУВАЮ** СЯБЕ. БЫЦЦАМ ЯНО ПРАНІКАЕ **ЎНУТР** МЯНЕ.


НЕ!


АГОНЬ.








МВАХ?


МВААААХХ!


АУМММММФФ...


У ГЭТЫМ МЕС-ЦЫ... БОЛЬШ НЯМА МАГІІ.
І, ЛІЧУ, Я НАСТУП-НАЯ... Я АДЧУВАЮ, ЯК НЕШТА ЦЯГНЕ МЯНЕ.



ДЗЯКУЙ, БЕККА.


Я ТОЛЬКІ ГЛУПАЯ ДЗЯЎЧЫНКА, ЯКАЯ РАСПАЧАЛА ЎСЁ ГЭТА.
ТЫ НЕ МАГ-ЛА ВЕДАЦЬ, ШТО ЗДА-РЫЦЦА.
І ЎСЁ Ж...


ГЭЙ, СУПЕРМЭН... БЕРАЖЫ ЯГО, ДОБРА?
МАГЧЫМА, ЁН І ВЫГЛЯ-ДАЕ СТРАШЭННА, АЛЕ ЁН ЗНАЧНА МІЛЫ, ЧЫМ ЗДАЕЦЦА.


БУДУ МЕЦЬ НА ЎВАЗЕ.


БЫВАЙ...




Я НЕ ГАТОВЫ РАЗМАЎЛЯЦЬ ПРА ДЭМІЕНА, КЛАРК. І НЕ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО КАЛІ-НЕБУДЗЬ БУДУ.
АЛЕ ДЗЯКУЙ, ШТО ПРЫЙШОЎ СЁННЯ.
КАНЕШНЕ, БРУС.


І... КАЛІ ХОЧАШ ЗАСТАЦЦА ПАТРУЛІРАВАЦЬ СА МНОЙ...
...Я НЕ СУПРАЦЬ.
КАНЕШНЕ, Я...


О. ЦЯПЕР ТЫ АКАЗВАЕШ ПАСЛУГУ МНЕ. ВЫДАТНА.


ТОЙ ЯШЧЭ СЯБАР.
КАНЕЦ